# *МАГІЯ ТВОРЧАСЦІ*



**22 снежня 2022 года ў офісе Саюза пісьменнікаў Беларусі ў Гродне зноў сабраліся слухачы Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы. Тэма чарговых заняткаў «Ідэя мастацкага твора» гучыць вельмі сур'ёзна. Але пры бліжэйшым разглядзе ўсё аказалася зусім не сумным, а наадварот, вельмі займальным і карысным. Нават не абышлося без магіі!**

У занятках прынялі ўдзел гродзенскія літаратары: старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Людміла Кебіч; прадстаўнікі СПБ: вядучы спецыяліст ГрАА СПБ, сцэнарыст Ніна Домань; паэт, бард, блогер Анатоль Апанасевіч; паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык, а таксама пастаянныя слухачы школы: кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая; гродзенская паэтэса-аматар Наталля Солтан; член літаб'яднання «Надзея», празаік Кацярына Калік; беларускі празаік, аўтар трох кніг Ірына Салата; дзіцячая пісьменніца-аматар Вольга Дзіканава *(на фота ніжэй).* Сустрэча складалася з трох блокаў – тэарэтычнага, практычнага і аналітычнага.

На старце заняткаў слухачы азнаёміліся з азначэннямі мастацкай ідэі і ідэі літаратурнага твора, пазнаёміліся з разнавіднасцямі ідэі ў літаратуры, пастараліся засвоіць, што такое ідэйны змест твора, чым паняцце «ідэя» адрозніваецца ад аўтарскай задумы і аўтарскай пазіцыі, а таксама як яны ўзаемазвязаны. З выкарыстаннем некаторых канкрэтных прыкладаў пагаварылі аб тым, як няпроста часам бывае вылучыць ідэю твора, пра тое, як яна працуе з нашай свядомасцю, і да чаго прыводзіць яе няправільная трактоўка.

Вынікі другога, практычнага блока адкрыта парадавалі. За нейкіх паўгадзіны на свет з'явіліся вельмі цікавыя, арыгінальныя мастацкія экспромты: лірычная і празаічныя мініяцюры, вершы, апавяданне і нават тэкст песні.

У ходзе аналізу напісаных твораў удзельнікі грамадска-адукацыйнага праекта прыйшлі да высновы, што ідэя літаратурнага твора можа не залежаць ад аўтарскай задумы і аўтарскай пазіцыі. Тое, як нечакана сталі праяўляць сябе ідэі нованароджаных твораў, заслугоўвае асобнага аповяду. Але і гэты аповяд не зможа перадаць чараўніцтва самастойнасці і незалежнасці элементаў ідэйнага зместу ад волі аўтара. Нечакана ў творах сталі ўзнікаць зусім непрадбачаныя ідэі. Творы калег сталі аказваць на аўдыторыю незапланаваныя аўтарамі, нечаканыя эфекты. Самым каштоўным з іх напэўна варта прызнаць натхненне. Напрыклад, Анатоль Уладзіміравіч Апанасевіч натхніўся апавяданнем, якое выйшла з-пад пяра Кацярыны Васільеўны Калік, і ўжо пасля занятку склаў верш у тэму апавядання. Калі мы падрабязна загаварылі пра ідэі нашых канкрэтных твораў, з аўдыторыяй стала адбывацца нешта дзіўнае. Магчыма, так і павінна быць у такіх сітуацыях. Усе сталі літаральна фантанаваць новымі ініцыятывамі і смелымі арыгінальнымі задумамі. Сапраўды магія творчасці…

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** у гродзенскім офісе Саюза пісьменнікаў Беларусі праходзяць заняткі грамадскай літаратурнай школы на тэму «Ідэя мастацкага твора». 22 снежня 2022 года.











**Вольга Дзіканава**



**Выступае празаік Ірына Салата**




**Кацярына Калік**



**Паэтэса-аматар Наталля Солтан**


**У Святланы Глембоцкай атрымалася апавяданне-квэст**



**Усе разам**
***Фота*** Анатоля Апанасевіча і Ніны Домань

***

***Сардэчна віншуем слухачоў Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы, празаікаў Ірыну Салату і Кацярыну Калік з перамогай (дыпломы III ступені) у Рэспубліканскім літаратурным конкурсе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прысвечаным Году гістарычнай памяці. Шчыра жадаем гродзенскім літаратарам моцнага здароўя, невычарпальнага натхнення і новых перамог!***

***Так трымаць і не спыняцца, шаноўныя! Вы – наш гонар, а вашы дасягненні – найлепшая рэклама для нашай грамадскай літшколы!***


Нацыянальная акадэмія навук Беларусі
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі
Інстытут гісторыі НАН Беларусі

ДЫПЛОМ
трэцяй ступені
ў намінацыі
«Вялікая Айчынная вайна ў памяці маёй сям'і»
ўзнагароджваецца
САЛАТА
Ірына Аркадзьеўна
пераможца Рэспубліканскага конкурсу творчых работ, прысвечаных Году гістарычнай памяці

Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі — У.Р.Гусакоў
2022


Нацыянальная акадэмія навук Беларусі
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі
Інстытут гісторыі НАН Беларусі

ДЫПЛОМ
трэцяй ступені
ў намінацыі
«Вялікая Айчынная вайна ў памяці маёй сям'і»
ўзнагароджваецца
КАЛІК
Кацярына Васільеўна
пераможца Рэспубліканскага конкурсу творчых работ, прысвечаных Году гістарычнай памяці

Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі — У.Р.Гусакоў
2022



САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ